**УДК 808.26-313(047.3)** **DOI 10.52928/2070-1608-2025-76-4-38-42**

# МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ ЛЁСУ БЕЛАРУСІ НА СТАРОНКАХ ЧАСОПІСА “БЕЛАРУСКІ ПІЯНЕР” У 1924–1929 ГГ.[1]

***канд. філал. навук В.Р. СЛІВЕЦ***
***(Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна)***
***ORCID: https://orcid.org/0009-0009-7618-4241***

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці мастацкай рэпрэзентацыі вобраза Беларусі, яе мінулага на старонках часопіса “Беларускі піянер” як часткі нацыянальнага наратыву беларускай літаратуры пачатку XX ст. Крыніцамі фактычнага матэрыялу для аналізу паслужылі мастацкія і публіцыстычныя тэксты, адабраныя шляхам суцэльнай выбаркі з нумароў часопіса “Беларускі піянер” за 1924–1929 гады (асноўныя метады даследавання – культурна-гістарычны метад, інтэрпрэтацыйны і кантэкстуальны аналіз).*

*Адлюстраванне апазіцыі двух часавых планаў (дарэвалюцыйнага і паслярэвалюцыйнага грамадства) і проціпастаўленне сацыяльна-палітычных умоў жыцця ў Савецкай і Заходняй Беларусі вызначаецца як асноўная мастацкая стратэгія выяўлення беларускай гісторыі ў мастацка-публіцыстычным дыскурсе часопіса, накіраваная на выхаванне ў дзяцей і юнацтва сістэмы ўстойлівых перакананняў аб культурна-гістарычных і сацыяльных умовах, этапах станаўлення і развіцця нацыянальнай самабытнасці і дзяржаўнасці.*

**Ключавыя словы:** *вобраз Беларусі, вобраз мінулага, нацыянальны наратыў, мастацкая стратэгія, мастацка-публіцыстычны дыскурс.*

**Уводзіны.** Першы нумар дзіцячага часопіса “Беларускі піянер”, прымеркаваны да шостай гадавіны ўтварэння камсамолу, выйшаў у друк у снежні 1924 г. І калі ўзнікненне такіх выданняў, як літаратурна-навуковага месячніка беларускай моладзі “Лучынка” (1914) і часопіса “Зоркі” (1921–1922), было абумоўлена росквітам ідэй нацыянальна-культурнага адраджэння і асветніцкімі задачамі беларусізацыі, то “Беларускі піянер”, які стаў органам піянерскай арганізацыі, відавочна быў скіраваны на сістэмнае забеспячэнне камуністычнага выхавання дзяцей БССР, “грамадзян свайго часу” [1, с. 3]. Адпаведна, апазіцыя двух часавых планаў, прадстаўленых у кантэксце мастацкіх твораў і публіцыстычных допісаў на старонках часопіса, – мінулага (дарэвалюцыйнага грамадства) і новай рэчаіснасці, якую сцвярджала Савецкая дзяржава, – стала, на наш погляд, вызначальнай мастацкай стратэгіяй у фарміраванні светапогляду падрастаючага пакалення, якому і належала стаць творцамі сваёй будучыні, вольнай, пазбаўленай сацыяльнага прыгнёту і рэлігійнага светаўспрымання.

У тым ці іншым аспекце мастацка-публіцыстычны дыскурс беларускага друку для дзяцей першай паловы XX ст. станавіўся аб’ектам даследавання спецыялістаў у галіне журналістыкі, гісторыі, літаратуразнаўства. Так, С. Харытонава разглядала яго як частку беларускіх медыя для дзяцей з пункту гледжання фарміравання іх візуальна-семантычнай структуры і рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу ў зменлівых сацыякультурных, палітыка-эканамічных і тэхніка-тэхналагічных умовах развіцця нацыянальнай інфармацыйнай прасторы ў XX–XXI стст. [2]. Т. Луйгас аналізаваліся грамадска-палітычныя ўмовы зараджэння і развіцця друку для дзяцей і падлеткаў на Беларусі, у сувязі з гісторыяй фарміравання яе дзяржаўнасці, у прыватнасці [3]. Ідэйна-тэматычны змест перыядычных выданняў для дзяцей і юнацтва Т. Борбат, І. Воюш, А Макарэвіч, М. Яфімавай вывучаўся ў кантэксце комплекснага гісторыка-літаратуразнаўчага даследавання працэсу станаўлення беларускай літаратуры, разлічанай на дзіцячую аўдыторыю [4]. Аднак асаблівасці мастацкай рэпрэзентацыі вобраза Беларусі, яе мінулага на старонках перыядычных выданняў для дзяцей як часткі нацыянальнага наратыву беларускай літаратуры пачатку XX ст. у айчынным літаратуразнаўстве яшчэ не станавіліся аб’ектам навуковай цікавасці, што па сутнасці і стала мэтаю нашага даследавання, крыніцамі фактычнага матэрыялу для якога паслужылі мастацкія і публіцыстычныя тэксты, адабраныя шляхам суцэльнай выбаркі з нумароў часопіса “Беларускі піянер” за 1924–1929 гг. (асноўныя метады даследавання – культурна-гістарычны метад, інтэрпрэтацыйны і кантэкстуальны аналіз).

**Асноўная частка.** У вершы “Нас спавівалі туманам балоты…” У. Дубоўка, рэдактар першага нумара, пастацку інтэрпрэтаваў лозунг, пад якім выходзіў часопіс: “Змена змену рыхтуе сабе: піянер – камсамол – КПБ” (пазней быў зменены на “Да змагання за справу працоўных – будзь гатоў!”), урачыста сцвярджаючы перамогу новага грамадскага ладу: *І ў Бабруйску, і Слуцку, і Менску, / Віцебску, ды і на Сажы – агнём, / вогненным морам юнацкая змена. / Мы Камсамолу на змену ідзём*[2] [1, с. 12]. Мінулае нашай краіны паэтам адлюстроўвалася пры дапамозе змрочных вобразаў *чорных туманаў*, *балота*, *мглы*, *сцюжы іглістай*, *палыну-лебяды* з выразнай адмоўнай канатацыяй. Адпаведна былі створаны малюнкі з гаротнага жыцця працоўнага люду, дзяцей (*“Маці хадзіла у двор на работу, / сына ў посцілцы на карку нясла”; “Сэрца малое: дрыжыць і дрыжыць…”; “Мы і смяяліся, нават, нясмела; / слёзы і слёзы, за імі бяда…”* [1, с. 12]).

[1] Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (дагавор № 1410/2021 ад 22.03.2021 г.).

[2] Тут і далей цытаты з “Беларускага піянера” падаюцца ў адпаведнасці з Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, зацверджанымі Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г. № 420-З.

Падтрымліваючы ідэйную канцэпцыю выдання, на старонках часопіса дакастрычніцкі перыяд жыцця беларусаў аўтарамі паказваўся пераважна з негатыўнага боку. Вобразы-сімвалы *мглы, чорных туманаў* (У. Дубоўка)*, запляснелага жыццёвага балота* (М. Нікановіч), *хмары змрочнай* (М. Багунец) сталі тыповымі ў адлюстраванні мінулага, а матывы няволі, панскага прыгнёту, катавання, голаду, здзекаў, гора, непісьменнасці, сіроцтва і беспрытульнасці – скразнымі, на кантрасце з якімі выразней выглядалі чаканыя пераўтварэнні ў грамадстве. Прычым самым "эпіцэнтрам" такога *балота* аўтарам уяўлялася вёска, дзе працягвалі захоўвацца заганы і той лад жыцця, што актыўна крытыкаваўся савецкай уладай. Напрыклад, у апавяданні "Маладыя храсткі" ўсталяваныя звычкі, парадак вядзення сельскай гаспадаркі, які даўно ўжо не дае ніякага прыбытку, таксама параўноўваюцца з балотам. У цэлым жа ў беларускай моўнай свядомасці і літаратурнай традыцыі гэты вобраз з'яўляецца архетыпічным і, як прасочана Л. Леванцэвіч, часцей метафарызуецца ў значэнні 'ўсё, што характарызуецца застоем, адсутнасцю жывой дзейнасці, маральным падзеннем' [5, с. 248–249].

У названым апавяданні прадметам параўнання старога ладу жыцця сялянства становіцца канкрэтны лакальны вобраз – балота *Галіцы* і *Кавалёвай стругі*: *"не загоніш туды й чорта, гразь, нетра і так цэлы век. Балота пустое, а людзі мучацца. Прыдзецца з шнурка тры посцілкі травы, дык далажыш тры дні працы. Гэта ж не хаханькі дастаць з галіцы сена! Людзі тапіліся даўней там. Сарвешся з кладкі і – прапаў"* [6, с. 5]. Дарэчы, *Кавалёва струга* таму і атрымала такую назву, бо некалі ў ёй утапіўся каваль. На гэты заняпад і патрэбу шукаць выйсце з яго адкрывае вочы аднавяскоўцам хлопчык Пятрусь, які пэўны час жыў у дзядзькі ў горадзе і засвойваў ад яго асновы аграрнай навукі. Менавіта ён як прадстаўнік маладога пакалення, новай фармацыі пераканальна даводзіць *"свежую думку"* аб тым, што ўжо пара *"вызваліцца ад гэтай гразі, жыць па-чалавечаму"* [6, с. 5]: па-новаму весці гаспадарку (не так, як заўсёды рабілі, а як таго патрабуе навука), асушыць балота і даць *"маладым храсткам"* магчымасць цягнуцца да сонца.

Падобная карціна занядбалага сялянскага быту – *"жыццёвага балота"* – ствараецца ў апавяданні М. Нікановіча "Перарадзіліся": *"Аднастайнае і нуднае жыццё ў гэтай вёсцы: учора, як сягоння, а сягоння, як заўтра… Нішто, здаецца, не можа парушыць ціш запляснелага жыццёвага балота… <…> Ды к гэтаму яшчэ беднота вялікая: боты вёска не бачыць, паркалёвая рубашка – дзіва…* [7, с. 3]. На думку аўтара, штуршком для "перараджэння" вёскі павінны стаць культурныя пераўтварэнні, якія, у першую чаргу, зменяць светапоглядныя асновы людзей, што дагэтуль грунтаваліся на рэлігійных уяўленнях, якія, як вядома, проціпастаўляліся камуністычнаму атэізму: *"Ну, як водзіцца: дзе пануе непісьменнасць, беднота, гразь – там і рэлігійныя забабоны з папом на чале гуляюць ва ўсю, як кажуць. Аб рэвалюцыйных святах ніхто нічога не ведае. Усёроўна, як іх ніколі не было і няма. Затое кожнае хоць і маленькае святца: Мікола, Юр'я, Ганны – ведаюць і святкуюць усе шчыра…"* [7, с. 3]. Арганізацыя культурна-асветніцкай дзейнасці сярод вясковага насельніцтва – той сродак барацьбы з непісьменнасцю і рэлігіёзнасцю, які павінен быў дапамагчы людзям змяніць царкву на "ленінку", а стары будынак капліцы перабудаваць у школу.

Тым жа пафасам прасякнуты радкі верша Янкі Купалы "Заўсёды гатоў!..", у якіх гучыць прамы заклік да руйнавання ўсталяваных парадкаў як следства абмежаванасці светапогляду і закасцянеласці мыслення, сфарміраваных народнымі рэлігійнымі ўяўленнямі: *Я таксама разбураць стары лад, / Дзе застаўся ад мінулых вякоў, / Заўсёды гатоў! // Хоць бабулі мне бурчаць, не маўчаць, / Што з багамі ніяк не мірuся… / Чым папала, я гаціць буду гаць; / Я не толькі ваяваць проць багоў, – / Нават чорта ганяць з Беларусі / Заўсёды гатоў!* [8, с. 1].

Асобна ставілася рэлігійнае пытанне. Паводле марксісцка-ленінскай тэорыі, рэлігія і царква разглядаліся як прылада для адурманьвання працоўнага класа. Адпаведна, актыўна праводзілася антырэлігійная прапаганда, работа па дыскрэдытацыі хрысціянскага веравучэння (параўн. назвы асобных публіцыстычных артыкулаў і мастацкіх твораў: *"Нам «святых апекуноў» ураджаю не патрэбна", "Не трэба нам багоў", "Прэч папоў і гарэлку!", "Вялікдзень – свята нашых ворагаў"*). Вобразы прадстаўнікоў духавенства падаваліся пераважна карыкатурна-саркастычна альбо з падкрэслена негатыўнага богу – як п'яніцы, хлусы і ўвогуле невялікага розуму людзі: *"І што гэта за разумная галава ў нашага бацюшкі, проста ж табе лысіна, дык праз усю галаву розумам свеціць"* [9, с. 7] ("У вербную нядзелю" Алеся з Галіцы, "Разумная бабуля" В. Мурынца і інш.). Зноў жа ствралася апазіцыя "старога" (непісьменнага, адсталага, пазбаўленага аб'ектыўнага бачання рэчаіснасці) і "новага" (прагрэсіўнага, заснаванага на перадавых дасягненнях навукі і рацыянальным мысленні) ладу. П'еса А. Цітавай "Старое і новае" якраз і пабудавана на такім проціпастаўленні: з аднаго боку – *Поп, Шаптуха, Брудната* і *Дробная гаспадарка*, а з другога – *Чыстата, Асвета, Медыцына* і *Калгаспадарка* [10, с. 9–10].

Вядома, рэлігійныя вераванні беларусаў маюць глыбокія карані, тым больш, што ў іх цесна перапляліся язычніцкае і хрысціянскае разуменні парадкаў светаўладкавання. На гэтым і акцэнтавалася ўвага. У матэрыялах часопіса (у прапанаваных маладым чытачам мастацкіх і публіцыстычных тэкстах) паслядоўна даводзілася думка аб "нелагічнасці" і "несамадастатковасці" хрысціянскіх догмаў, ставілася задача выкрыць "паганскую" аснову рэлігіі, што ніяк не стасуецца з узроўнем жыцця сучаснага грамадства. Так, у артыкуле "Адкуль з'явіліся «Каляды»" зроблена спроба даць навуковую версію гісторыі нараджэння Ісуса Хрыста: падаюцца аналогіі з іншымі рэлігіямі свету, культам агню, тлумачыцца дата святкавання нараджэння Хрыста – 25 снежня – як дня сонцастаяння і г.д. Вынік такіх разважанняў наступны: "Бог, вучаць папы, усім на зямлі правіць, усё, што робіцца, – робіцца па яго жаданню. Паўставаць супроць яго не можна. На зямлі трэба ўсё цярпець, затое будзе добра на небе. Значыцца, калі пан і цар здзекуюцца з беднага селяніна і рабочага, дык паўставаць супроць іх не можна, бо гэта ж будзе супроць бога. Нам бог не патрэбен. Аб гэтым цяпер ведае кожны селянін і кожны рабочы. Мы цяпер

нікому *нічога не верым*, а ўсё хочам *знаць*” [11, с. 33]. Да падобных высноў прыходзіць і аўтар нарыса “Хто васкрос”, разважаючы над гісторыяй узнікнення старажытных вераванняў: *“Рабочы народ сваімі рукамі лёгка створыць сабе рай на зямлі, а рай на тым свеце хай бяруць сабе паны”* [12, с. 4].

Замест усталяваных рэлігійных святаў прапануецца ўвесці тыя, што адпавядаюць новай ідэалогіі і рэаліям новага грамадства: *“А святкаваць вясну мы і без гэтага можам. Для гэтага ў нас ёсць свята 1-га мая. Заместа нейкага там Мардука, Озірыса ці Хрыста мы можам шанаваць усясветны пралетарыят. Ён васкрасіць зямлю лепш за якога там Мітру”* [12, с. 4]. Увядзенне Свята першай баразны разглядаецца як альтэрнатыва праведзення традыцыйных “святых вечароў”, ці “святак”. Адпаведна, шквал крытыкі абрынаецца і на ўшанаванне хрысціянскіх святых Міколы і Юр’я – апекуноў сельскай гаспадаркі і земляробства паводле народных уяўленняў: “Нам, свядомым будаўнікам новага жыцця, *юраўскай ды мікалаеўскай дапамогі не трэба*! Мы ведаем ёй цану. Мы будзем урабляць зямлю так, як вучыць навука, будзем клапаціцца аб ураджаі самі, а не спадзявацца на такіх апекуноў” [13, с. 3]. Вялікдзень абвяшчаецца *“спадчынай дзікунства”, “святам п’янства і хуліганства”* [14, с. 5].

Такім чынам, рэлігія называлася перажыткам мінулага, своеасаблівым атрыбутам прыгнёту, пакорлівасці і безабароннасці чалавека перад царквою і панствам, што не адпавядала антыпрыгонніцкай палітыцы савецкай улады.

Прыгон, паншчына, белапольская акупацыя – стрыжнёвыя тэмы часопісных публікацый “Беларускага піянера”, бо датычыліся тых старонак беларускай гісторыі, на якіх стаяла сучаснасць. Так, своеасаблівым летапісам заняволення, барацьбы з прыгняталькікамі і вызвалення ад іх выглядае вершаваная казка К. Шавель “Камень”, паводле якой ключавы персанаж – *камень* – апавядае гісторыю свайго жыцця і вандровак, апісваючы грамадскія і гістарычныя змены, што адбываліся на беларускіх землях на працягу некалькіх стагоддзяў [15, с. 6–8]. У большасці сваёй змешчаныя ў часопісе мастацкія творы прасякнуты ідэямі антыпольскай барацьбы і адрозніваюцца надзвычайнай трагічнасцю, бо, як правіла, утрымліваюць сцэны забойства, катаванняў, і ў той жа час характарызуюцца рэвалюцыйным пафасам, верай у лепшую будучыню, якую павінна будаваць і ўмацоўваць маладое пакаленне. Нярэдка ў цэнтры дзеяння гэтых твораў апынаюцца дзеці, вымушаныя помсціць за сваіх бацькоў і ісці да змагання (апавяданні “Бацькаў сын” М. Зарэцкага, “Юрка” А. Якімовіча, “Кажы, дзе твой сын” З. Бядулі, “Спатканне” С. Шыманскага, “Грышка” П. Рагачэўскага і інш.): *“Я з сённяшняга дню – паўстанец. Я цярпець не буду, калі мяне будуць мучыць, грабіць і катаваць…”* [1, с. 17]; *“Білі іх за тое, што яны ўцякалі туды, на ўсход; уцякалі на сваю бацькаўшчыну Беларусь, да сваіх братоў і сяброў. А на ўсход хлапцоў так цягнула і вабіла”* [16, с. 15].

Асноўнай мастацка-публіцыстычнай стратэгіяй часопіса стала супрацьпастаўленне рэалій быцця вольнай Савецкай і Заходняй Беларусі – *“месца турмаў і крыві”, “дзе гора і здзекі пануюць”*: *“Калі тут, у Савецкай Беларусі і наогул у Саюзе ССР мы, дзеці, можам вучыцца ў школах на сваёй роднай мове, можам арганізоўвацца ў атрады піянераў, якія рыхтуюцца пайсці на змену сваім старэйшым таварышам камсамольцам, – дык нічога падобнага ў Заходняй Беларусі няма. Беларускія школы, якія там былі, польская буржуазія пазачыняла”* [1, с. 28]; *“У савецкай краіне дзеці рабочых і сялян маюць свае арганізацыі, піянерскія атрады. У школах аб’ядноўваюцца ў розныя гурткі, свабодна абмяркоўваюцца розныя пытанні, тут дзеці – новыя будаўнікі. Недалёка ад нас – у Заходняй Беларусі (пад панскай Польшчай) – над маладым пакаленнем – дзецьмі – учыняюцца здзекі. Там над галовамі дзяцей вісіць панскі бізун, там настаўнік – кат, там чуюцца енкі дзяцей”* [17, с. 19]. Мастацкая рэпрэзентацыя Савецкай і Заходняй Беларусі таксама падаецца праз вобразы-кантрастывы. Напрыклад: *А ўсход гарыць / Залатым агнём: / Ноч змянілась там / Днём, вясёлым днём. // А ў нас вось тут / Хмары сцелюцца: / Ой, раве, гудзе / Тут мяцеліца. // Абхінула ўсё / Хусткай чорнаю / Хмара змрочная, / Непакорная* [18, с. 5]. Як бачым, у адлюстраванні лёсу Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы аўтары і рэдакцыйная калегія часопіса “Беларускі піянер” прытрымліваліся цвёрдай пазіцыі, сугучнай ідэйна-палітычным прынцыпам новага савецкага грамадства, якая выражалася ў негатыўна-асуджальным стаўленні да ўмоў і наступстваў Рыжскага міру.

Грунтам для стварэння новага ладу жыцця, паводле канцэпцыі часопіса, павінны былі стаць карэнныя пераўтварэнні: *Успамінаць нам старога не трэба, / Дзе бацькі ў падняволлі стагналі… // І дзяцей, што жылі без хлеба, / “Абадранцамі” сытыя звалі <…> Дык шчыльней жа калёны, атрады, / Новых сільных рыхтуйце арлоў. // У бой апошні, на барыкады, / Піянерскі атрад, будзь гатоў!* [19, с. 7]. Адсюль у процілегласць змрочна-негатыўным вобразам *балота, туманоў, імглы* паўстаюць вобразы *зялёнай руні, гаці, маладых храсткоў, вясны* і інш. як сведчанне ўпэўненасці ў лепшай будучыні, пазначанай толькі станоўчымі зменамі: *...Дзе ўчора звінела каса, / У гурбы клалася панскае жыта, / Сёння кветкай вясна расцвіла, / Сёння наша – працоўных – зямля / Яе росквітам новым абвіта* [11, с. 26].

Вялікая ўвага ў выхаванні падрастаючага пакалення надавалася пашырэнню асветы, што прадугледжвала не толькі ліквідацыю непісьменнасці, але і вывучэнне гісторыі, лепшага вопыту папярэднікаў: *“Кожны піянер павінен заўладаць паступова ўсімі тымі ведамі, якія набыты чалавецтвам на працягу доўгай гісторыі. Не можа быць камуністага кіраўніка, будаўніка, які б не быў добра падкаваны на чатыры нагі па сваёй агульнай адукацыі (абразаванню)”* [20, с. 1]. Належнае месца адводзілася наладжванню краязнаўчай працы ў піянерскім асяроддзі па вывучэнні культурных набыткаў беларусаў, фальклорнай спадчыны, гісторыі краю, што павінна садзейнічаць працэсу *“адраджэння Беларусі”* [19, с. 17]. Так, пры арганізацыі канцэртных вечароў рэкамендавалалася ўключаць у праграму, акрамя твораў (вершаваных ці музычных) на піянерскую ці камсамольскую тэматыку, фальклорныя – беларускія народныя песні [1].

Вырашэнне пытання нацыяльнага і сацыяльнага вызвалення, распачатага Вялікім Кастрычнікам, бачылася ва ўсведамленні самабытнасці беларускага народа, адраджэнні культуры, якая мае глыбокія карані ў далёкім

мінулым Беларусі. Прыкладам, на думку А. Якімовіча, члена рэдкалегіі часопіса, можа служыць постаць Францыска Скарыны – *"першага беларускага піянера ў культурнай справе"*. Заслугу Скарыны аўтар найперш бачыць у тым, што той свядома ставіў перад сабою ідэю служэння *"простаму люду"* [21, с. 2].

Дзеля фарміравання ў дзяцей і юнацтва актуальнага свайму часу ўяўлення аб адметнасцях беларускай культуры і адпаведнага ўспрымання рэчаіснасці "Беларускі піянер" актыўна супрацоўнічаў з аб'яднаннем беларускіх паэтаў і пісьменнікаў "Маладняк": *"Піянеры і камсамольцы! Сачыце за выхадам Маладняцкіх твораў, купляйце і чытайце творы навейшай беларускай літаратуры – Маладнякоўцаў. Творы Маладнякоўцаў як у люстры адбіваюць наша маладое сённяшняе жыццё і наша змаганне за ўладу працоўных ва ўсім свеце"* [7, с. 25]. Менавіта творы, напісаныя сябрамі і студыйцамі "Маладняка" (П. Труса, С. Серады, М. Нікановіча і інш.) сталі "праграмнымі" ў дыскурсе "Беларускага піянера", бо яскрава выяўлялі апазіцыю вобразаў запрыгоненай, акупаванай Беларусі і вольнага грамадства, арыентаванага на светлую будучыню і пераможнае шэсце.

**Заключэнне.** Такім чынам, аналіз мастацкіх тэкстаў, змешчаных на старонках штомесячнага часопіса для дзяцей "Беларускі піянер" (1924–1929 гг.), дазволіў вызначыць, што ў рэпрэзентацыі беларускай гісторыі аўтары прытрымліваліся мастацкай стратэгіі, якая грунтавалася на адлюстраванні апазіцыі двух часавых планаў (дарэвалюцыйнага і паслярэвалюцыйнага грамадства) і проціпастаўленні сацыяльна-палітычных умоў жыцця ў Савецкай і Заходняй Беларусі. Урачыста-прапагандысцкі пафас твораў, якія раскрывалі перспектывы новых, здзейсненых пад знакам камуністычных ідэалаў грамадскіх пераўтварэнняў і прадугледжвалі каштоўнасную пераарыентацыю мыслення найперш маладога пакалення, узмацняўся на фоне паказу аджыўшых сваё "нормаў" і традыцый народнага быцця, што заканамерна вялі да яго заняпаду. Абраныя аўтарамі мастацка-стылістычныя прыёмы (стварэнне падкрэслена змрочных і негатыўных вобразаў альбо саркастычна-з'едлівае адлюстраванне рэалій "старога" ладу) рабілі абасалютна відавочным выбар на карысць прапанаваных змен: ад непісьменнасці – да ўсеагульнай адукацый, ад цемрашальства – да рацыянальна-навуковых высноў, ад бяспраўнасці і прыгнёту – да роўнасці і незалежнасці. А зварот да так званага заходнебеларускага пытання стаў выразным сведчаннем важнасці неадкладнага вырашэння праблемы нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення, падкрэсліваў палітычную значнасць кансалідацыі грамадства ў такі надзвычай важны перыяд яго развіцця. Падобнае фарміраванне ўяўленняў падрастаючага пакалення аб лёсе Беларусі павінна было садзейнічаць выхаванню ў дзяцей і юнацтва сістэмы ўстойлівых перакананняў аб культурна-гістарычных і сацыяльных умовах, этапах станаўлення і развіцця нацыянальнай самабытнасці і дзяржаўнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларускі піянер: штомес. дзіц. часоп. для дзяцей: орган ЦК ЛКСМБ і Наркамасветы БССР. – 1924. – № 1. – 25 с.
2. Харитонова С.В. Белорусские медиа для детей: системообразование, визуально-семантическая структура, воспитательный потенциал: автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.01.10 / Бел. гос. ун-т. – Минск, 2022. – 44 с.
3. Луйгас Т.А. Становление белорусской печати для детей и подростков // Веснік БДУ. Сер.4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2005. – № 3. – С. 105–109.
4. Беларуская дзіцячая літаратура: вучэб. дапам. / А.М. Макарэвіч [і інш.] ; пад агул. рэд. А.М. Макарэвіча, М.Б. Яфімавай. – Мінск: Выш. шк., 2008. – 688 с.
5. Леванцевич Л.В. Концепт «Болото»: лингвокультурологическое содержание // Современные тенденции языкового образования: опыт, проблемы, перспективы: сб. ст. участников II Междунар. науч.-практ. конф., 23 марта 2020 г.; науч. ред. Л.Н. Набилкина, отв. ред. Д.Л. Морозов / Арзамасский филиал ННГУ. – Арзамас: Арзамас. ф-л ННГУ, 2020. – С. 246–251.
6. Беларускі піянер: штомес. дзіц. часопіс для дзяцей: орган ЦК ЛКСМБ і Наркамасветы БССР (Беларускі піянер). – 1925. – № 4 – 28 с.
7. Беларускі піянер. – 1925. – № 6. – 26 с.
8. Беларускі піянер. – 1926. – № 7. – 22 с.
9. Беларускі піянер. – 1926. – № 11. – 22 с.
10. Беларускі піянер. – 1929. – № 15. – 18 с.
11. Беларускі піянер. – 1927. – № 24. – 34 с.
12. Беларускі піянер. – 1928. – № 7. – 26 с.
13. Беларускі піянер. – 1929. – № 7. – 18 с.
14. Беларускі піянер. – 1929. – № 8. – 18 с.
15. Беларускі піянер. – 1927. – № 7. – 26 с.
16. Беларускі піянер. – 1925. – № 3. – 30 с.
17. Беларускі піянер. – 1927. – № 6. – 26 с.
18. Беларускі піянер. – 1927. – № 3–4. – 34 с.
19. Беларускі піянер. – 1925. – № 5. – 26 с.
20. Беларускі піянер. – 1925. – № 9–10. – 28 с.
21. Беларускі піянер. – 1925. – № 11. – 28 с.

*Паступіў 03.06.2025*

# ХУДОЖЕСТВЕННОЕ ОСМЫСЛЕНИЕ СУДЬБЫ БЕЛАРУСИ НА СТРАНИЦАХ ЖУРНАЛА «БЕЛАРУСКІ ПІЯНЕР» В 1924–1929 ГГ.

***канд. филол. наук О.Г. СЛИВЕЦ***
***(Мозырский государственный педагогический университет имени И.П. Шамякина)***

*В статье рассматриваются особенности художественной репрезентации образа Беларуси, ее прошлого на страницах журнала «Беларускі піянер» как части национального нарратива белорусской литературы начала XX века. Источниками фактического материала для анализа стали художественные и публицистические тексты, отобранные методом сплошной выборки из номеров журнала «Беларускі піянер» за 1924–1929 гг. (основные методы исследования — культурно-исторический метод, интерпретационный и контекстуальный анализ).*

*Отражение оппозиции двух временных планов (дореволюционного и послереволюционного общества) и противопоставление социально-политических условий жизни в Советской и Западной Беларуси определяется как основная художественная стратегия отображения белорусской истории в художественно-публицистическом дискурсе журнала, направленная на воспитание у детей и молодежи системы устойчивых представлений о культурно-исторических и социальных условиях, этапах становления и развития национальной идентичности и государственности.*

***Ключевые слова:*** *образ Беларуси, образ прошлого, национальный нарратив, художественная стратегия, художественно-публицистический дискурс.*

# ARTISTIC EVALUATION OF BELARUS DESTINY ON THE PAGES OF THE “BELARUSKI PIONEER” MAGAZINE IN 1924–1929

***V. SLIVETS***
***(Mozyr State Pedagogical University named after I.P. Shamyakin)***

*The article deals with the features of the artistic representation of Belarus image, its past on the pages of the “Belarusian Pioneer” magazine as part of the national narrative of Belarusian literature in the early 20th century. The sources of factual material for the analysis were belles-lettres and publicistic texts selected by continuous sampling from the issues of the “Belarusian Pioneer” magazine in 1924–1929 (the main research methods are the cultural-historical method, interpretative analysis and contextual analysis).*

*The description of the two periods (pre-revolutionary and post-revolutionary society) and the contrast of socio-political living conditions in Soviet and Western Belarus are defined as the main artistic strategy for revealing Belarusian history in the belles-lettres and journalistic discourse of the magazine, it is aimed at educating children and youth in a system of strong beliefs about cultural, historical and social conditions, stages of formation and development of national identity and statehood.*

***Keywords:*** *image of Belarus, image of the past, national narrative, artistic strategy, artistic and journalistic discourse.*